ЗАЦВЕРДЖАНА
загад ад 09.11.2026 № 243

ІНСТРУКЦЫЯ
Аб парадку арганізацыі і правядзення ў 2026-2027 гадах конкурсу п'ес "Купала. П'еса" аб народным паэце Беларусі Янку Купале

1. Дадзеная Інструкцыя вызначае парадак арганізацыі і правядзення ў 2026-2027 гадах конкурсу п'ес, прысвечаных народнаму паэту Беларусі Янку Купале (далей – конкурс).

2. Мэтамі конкурсу з'яўляюцца павышэнне якасці айчыннай драматургіі, стварэнне сучасных твораў пра асобу народнага паэта Беларусі Янкі Купалы і падрыхтоўка тэатральнай пастаноўкі да 145-годдзя з дня яго нараджэння для актуалізацыі рэпертуару дзяржаўных тэатраў.

3. Арганізатарам конкурсу з'яўляецца дзяржаўная ўстанова "Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы" (далей – Арганізатар), Партнёрам – установа "Дзяржаўны літаратурны музей Янкі Купалы" (далей – Партнёр).

4. Да ўдзелу ў конкурсе дапускаюцца асобы (прафесійныя і непрафесійныя аўтары) незалежна ад іх грамадзянства і ўзросту, якімі створаны арыгінальныя, раней не інсцэніраваныя і не апублікаваныя ў друку драматургічныя творы на беларускай або рускай мовах (далей – удзельнікі). У выпадку перамогі рускамоўнага твора Арганізатар за кошт уласных сродкаў забяспечвае яго пераклад на беларускую мову для далейшай пастаноўкі. Узаемадзеянне з перакладчыкам, уключаючы аб'ём яго аўтарскіх правоў і парадак выплаты яму грашовай узнагароды за публічны паказ спектакля, рэгулюецца асобнай аўтарскай дамовай.

Тэксты прадастаўляюцца ў фармаце .docx (шрыфт Times New Roman, 14 кегль, міжрадковы інтэрвал – дакладна 14).

5. Для рэгістрацыі ў конкурсе да 14 снежня 2026 года накіроўваецца заяўка на ўдзел у конкурсе па форме згодна з дадаткам 1, згода ў адпаведнасці з дадаткам 2 і творчы пакет (патрабаванні да творчага пакета гл. у дадатку 3) у электронным выглядзе на электронны (info@kupalauski.by) або на папяровым носьбіце на паштовы адрас Арганізатара (г. Мінск, вул. Энгельса, д. 7, 220030).

6. Дасылаючы заяўку, удзельнік гарантуе, што ён з'яўляецца адзіным аўтарам твора, тэкст не закранае правы трэціх асоб, а выкарыстанне гістарычных матэрыялаў не парушае заканадаўства Рэспублікі Беларусь, у тым ліку аб аўтарскім праве. Адказнасць за плагіят або парушэнне правоў трэціх асоб цалкам ускладаецца на ўдзельніка.

7. Матэрыялы, якія прадстаўлены з парушэннем патрабаванняў, вызначаных пунктам 5 дадзенай Інструкцыі, да разгляду не прымаюцца.

8. Конкурс праводзіцца ў наступныя творчыя этапы:

першы этап (лістапад – 14 снежня 2026 года) – праца ўдзельнікаў над стварэннем і прадастаўленне творчага пакета для адбору ў наступны этап; пасля завяршэння першага этапу з 14 па 18 снежня 2026 года журы будзе праведзены адбор удзельнікаў, якія праходзяць у другі этап конкурсу;

другі этап (21 снежня 2026 года – 19 сакавіка 2027 года) – стварэнне і

прадастаўленне поўных тэкстаў п'ес на падставе вынікаў першага этапу, пасля завяршэння другога этапу з 22 па 26 сакавіка 2027 года журы будзе праведзены адбор удзельнікаў (максімальная колькасць – 4), якія праходзяць у трэці этап конкурсу;

трэці этап (другая палова красавіка 2027 года) – стварэнне і паказ рэжысёрскіх эскізаў пастановак у межах "Купала. Лабараторыі" па п'есах фіналістаў, вызначэнне рашэннем журы з улікам вынікаў глядацкага галасавання пераможцы конкурсу.

9. З пераможцам конкурсу Арганізатарам заключаецца дамова на перадачу права выкарыстання п'есы, якая перамагла ў конкурсе. Арганізатар атрымлівае права першай пастаноўкі п'есы-пераможца. Пераможца пагаджаецца на магчымую рэжысёрскую рэдакцыю і адаптацыю тэксту пад сцэнічныя патрэбы паводле ўзгаднення з аўтарам. У выпадку немагчымасці рэалізацыі п'есы-пераможцы па тэхнічных, вытворчых прычынах ці ў выпадку недасягнення згоды з аўтарам па фінальнай рэдакцыі тэксту, Арганізатар пакідае за сабой права замяніць п'есу-пераможца на іншы твор, які прайшоў у трэці этап конкурсу.

10. П'есы астатніх ўдзельнікаў трэцяга этапу конкурсу накіроўваюцца ў якасці прапановы да пастаноўкі ў тэатральна-відовішчныя арганізацыі для азнаямлення.

11. Арганізатар пакідае за сабой права пры неабходнасці карэктаваць тэрміны правядзення творчых этапаў або спыніць конкурс на любым этапе з абавязковым паведамленнем удзельнікам і асвятленнем змен у дзяржаўных СМІ.

12. У межах другога этапу для ўдзельнікаў, якія прайшлі адбор, арганізуецца культурна-асветніцкая праграма, якая носіць рэкамендацыйны характар і ўключае ў сябе:

курс лекцый, якія будуць праводзіцца на базе Арганізатара з удзелам беларускіх і замежных спікераў;

працу з фондамі Партнёра;

экскурсію па экспазіцыях і філіялах Партнёра для вывучэння гістарычнага кантэксту і быту Янкі Купалы;

эксперыментальную акцёрскую чытку фрагментаў будучых п'ес акцёрамі Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы ў адным з філіялаў Партнёра з мэтай праверкі сцэнічнасці і рытмікі жывога маўлення.

Удзельнікам прадастаўляецца кантралюемы доступ да архіўных фондаў Партнёра ў адпаведнасці з унутраным рэгламентам і правіламі яго працы. Каляндарна-тэматычны план культурна-асветніцкай праграмы зацвярджаецца Арганізатарам. Да правядзення мерапрыемстваў культурна-асветніцкай праграмы Арганізатарам могуць запрашацца замежныя спецыялісты (эксперты).

13. Для падвядзення вынікаў кожнага этапу конкурсу і вызначэння ўдзельнікаў, якія пераходзяць у наступны этап, фарміруецца журы конкурсу. У склад журы могуць уваходзіць кіраўнікі і творчыя работнікі тэатраў, пісьменнікі, тэатразнаўцы, крытыкі, рэжысёры, літаратуразнаўцы і іншыя работнікі культуры. Персанальны склад журы вызначаецца Арганізатарам.

У склад журы не могуць уваходзіць асобы, якія з'яўляюцца аўтарамі (сааўтарамі) п'ес, вылучаных для ўдзелу ў конкурсе.

14. Пасяджэнне журы з'яўляецца правамоцным пры прысутнасці не менш за дзве трэці яго складу. Члены журы могуць прысутнічаць у анлайн-фармаце і пры неабходнасці высылаць сваё рашэнне ў электронным выглядзе. Рашэнне журы прымаецца простай большасцю галасоў,

афармляецца пратаколам, перагляду не падлягае. Пры роўнасці галасоў вырашальным з'яўляецца голас старшыні.

15. Асноўныя крытэрыі ацэнкі п'ес:

высокая мастацкая і драматургічная каштоўнасць твора;

мастацкае наватарства і стыль;

эстэтычная вартасць;

мастацкая цэласнасць і кампазіцыйная завершанасць;

актуальнасць і арыгінальнасць раскрыцця асобы, жыццёвага і творчага шляху Янкі Купалы.

Ацэначны ліст другога этапу конкурсу ў дадатку 4.

16. Інфармацыя аб правядзенні конкурсу размяшчаецца ў газеце "Культура", іншых сродках масавай інфармацыі, на афіцыйных сайтах арганізатараў у глабальнай камп'ютарнай сетцы Інтэрнэт і павінна ўтрымліваць звесткі аб месцы і тэрмінах правядзення конкурсу, умовах конкурсу, крытэрыях і парадку ацэнкі прадстаўленых спектакляў, парадку і тэрмінах аб'яўлення вынікаў конкурсу, а таксама іншыя неабходныя звесткі, прадугледжаныя грамадскім заканадаўствам.

17. Непасрэднае адміністраванне, каардынацыю і суправаджэнне ўсіх этапаў конкурсу ажыццяўляюць кіраўнік праекта і рэдактар літаратурнай часткі Арганізатара. У выпадку ўзнікнення дадатковых задач, якія не ўваходзяць у кампетэнцыю кіраўніка і рэдактара, адказнасць за іх разгляд, прыняцце рашэнняў і выкананне пераходзіць да профільных спецыялістаў і структурных падраздзяленняў тэатра, якія валодаюць адпаведнай кваліфікацыяй ў дадзенай вобласці. Кіраўнік і рэдактар садзейнічаюць у каардынацыі такіх пытанняў, аднак не нясуць адказнасці за вынікі іх выканання.

18. Выплата ўзнагарод, фінансаванне мерапрыемстваў конкурсу, уключаючы магчымае забеспячэнне запрошаных іншагародніх і замежных экспертаў пражываннем, аплатай транспартных выдаткаў, ажыццяўляецца за кошт Арганізатара і іншых сродкаў, не забароненых заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

Дадатак 1
да Інструкцыі парадку арганізацыі і правядзення ў 2026-2027 гадах конкурсу п'ес "Купала. П'еса" аб народным паэце Беларусі Янку Купале

Заяўка
на ўдзел у конкурсе п'ес аб народным паэце Беларусі Янку Купале

Прозвішча, імя, імя па бацьку _____
_____

Грамадзянства _____

Дата, месяц, год нараджэння _____

Кантактныя даныя (тэлефон, электронная пошта) _____
_____

Я, (прозвішча, імя, імя па бацьку), пацвярджаю, што валодаю аўтарскімі правамі на літаратурны твор, якая падаецца на ўдзел у конкурсе. У выпадку ўзнікнення спрэчных пытанняў з трэцімі асобамі, звязаных з аўтарскімі правамі на п'есу, абавязуюся вырашаць гэтыя пытанні самастойна.

Удзельнік

_____ _____
(подпіс) (ініцыялы, прозвішча)

Дадатак 2
да Інструкцыі парадку арганізацыі і правядзення ў 2026-2027 гадах конкурсу п'ес аб народным паэце Беларусі Янку Купале

Згода

Я, (прозвішча, імя, імя па бацьку), _____
_____,
Які(ая) пражывае па адрасе: _____
_____,
гэтым дакументам пацвярджаю сваю згоду на:

- публічны паказ арыгінальнага драматычнага твора, створанага мной у межах конкурсу п'ес аб народным паэце Беларусі Янку Купале ў 2026-2027 гадах у межах трэцяга этапу конкурсу;
- накіраванне твора ў дзяржаўныя тэатральна-відовішчныя арганізацыі Рэспублікі Беларусь;
- на апрацоўку персанальных дадзеных;
- на выкарыстанне інфармацыі пра мой твор падчас правядзення конкурсу ў дзяржаўных СМІ.

Гэтая згода з'яўляецца бестэрміновай і дзейнічае з моманту маёй рэгістрацыі ў конкурсе.

«____»_____2026 г._____(подпіс)_____(расшыфроўка)

Дадатак 3
да Інструкцыі парадку арганізацыі і правядзення ў 2026-2027 гадах конкурсу п'ес "Купала. П'еса" аб народным паэце Беларусі Янку Купале

У творчы пакет уваходзяць сінопсіс і адна гатовая сцэна будучай п'есы.

Сінопсіс – гэта кароткі, лінейны пераказ сюжэта і ідэйна-мастацкай задумы будучай п'есы ад пачатку да канца (фінал павінен быць прапісаны). Аб'ём – 1-2 старонкі фармату А4. Сінопсіс адказвае на наступныя пытанні:

Пра што твор і для чаго ён напісаны?

Дзе і калі адбываюцца падзеі (канкрэтны год жыцця Янкі Купалы, нашы дні, фантасмагарычная прастора і пад.)?

Кароткі пералік ключавых персанажаў з іх кароткай псіхалагічнай характарыстыкай і функцыяй у сюжэце.

Сціслы пераказ асноўных падзей п'есы па актах і сцэнах (завязка – развіццё канфлікту – кульмінацыя – развязка).

Аб'ём адной гатовай сцэны будучай п'есы ў рамках першаснага творчага пакета – ад 3 да 7 старонак друкаванага тэксту. Імя персанажа пішацца на наступным радку са звычайным водступам. Рэмаркі (дзеянні, эмоцыі) пішуцца з дужках, курсівам, унутры рэплікі або на асобным радку з павялічаным водступам слева. Пачатак сцэны заўсёды абазначаецца загалоўкам (напрыклад: СЦЭНА 1. Кабінет у Ляўках. Ноч.).

Тэксты дасылаюцца ў фармаце.docx (шрыфт Times New Roman, 14 кегль, міжрадковы інтэрвал – дакладна 14).

Дадатак 4
да Інструкцыі парадку арганізацыі і правядзення ў 2026-2027 гадах конкурсу п'ес "Купала. П'еса" аб народным паэце Беларусі Янку Купале

Ацэначны ліст прадугледжвае максімальную адзнаку – 50 балаў:

драматургічная структура і канфлікт (0 – 10 балаў): наяўнасць выразнай архітэктонікі, экспазіцыі, завязкі, развіцця дзеяння і кульмінацыі, мастацкая цэласнасць і кампазіцыйная завершанасць, наколькі зразумела прапісаны цэнтральны канфлікт;

сцэнічнасць і прыдатнасць да пастаноўкі (0 – 10 балаў): эстэтычная вартасць, патэнцыял увасаблення на сцэне, разуменне законаў тэатра, адсутнасць нагрувашчанасці спецэфектаў, якасць мізансцэнавання ўнутры сцэны;

глыбіня раскрыцця вобраза і тэмы (0 – 10 балаў): адпаведнасць тэме конкурсу, філалагічная і гістарычная слушнасць, адсутнасць штампаў, аб'ёмнасць і псіхалагізм персанажаў;

якасць дыялогаў і маўленчыя характарыстыкі (0 – 10 балаў): жывая сцэнічная мова, індывідуалізацыя маўлення кожнага персанажа, рытміка і дынаміка тэксту;

мастацкае наватарства і стыль (0 – 10 балаў): арыгінальнасць аўтарскага бачання, свежасць ракурсу, унікальны літаратурны стыль.

Журы ацэньвае тэксты п'ес пад лічбавымі шыфрамі без указання персанальных дадзеных аўтараў.